ПРАВАСЛА́ЎНЫЯ ДУХО́ЎНЫЯ ВУЧЫ́ЛІШЧЫ, духоўныя мужчынскія вучылішчы духоўнага ведамства, духоўныя навучальныя ўстановы, якія давалі пачатковую адукацыю і рыхтавалі дзяцей для служэння правасл. царкве. Да пач. 19 ст. функцыі вучылішчаў выконвалі семінарыі, якія сумяшчалі курс ніжэйшай і сярэдняй духоўнай школы. На Беларусі існавалі ў канцы 18 — пач. 19 ст. наступныя вучылішчы: Невельскае (1780, да 1804 — гімназія), Гомельскае (1781), Бабалуцкае (1808). Выкладаліся: катэхізіс, арыфметыка, чытанне і пісьмо рускае і царк.-славянскае, лацінская і польская мовы. У пач. 19 ст. духоўныя вучылішчы падзелены на павятовыя (для падрыхтоўкі і паступлення вучняў у духоўную семінарыю) і прыходскія (для падрыхтоўкі да павятовага вучылішча). У 1810 на гэтай аснове ў бел. губернях усталяваны 5 павятовых вучылішчаў (Аршанскае, Віцебскае, Гомельскае, Магілёўскае, Мсціслаўскае) і 15 прыходскіх (Бабалуцкае, Быхаўскае, Гомельскае, Дубровіцкае, Копыскае, Клімавіцкае, Любавіцкае, Магілёўскае, Мсціслаўскае, Невельскае, Себежскае, Уцеўскае, Чавускае, Чачэрскае, Чэрыкаўскае). Пасля некат. змяненняў іх статуты ў 1814 зацверджаны імператарам Аляксандрам I. Прыходскія вучылішчы мелі 2 класы з гадавым тэрмінам навучання ў кожным. Павятовае вучылішча мела 2 аддзяленні (па 2 гады ў кожным). Прыходскія вучылішчы падпарадкоўваліся павятовым, павятовыя — семінарыям. У 1830—40-я г. адкрываліся і закрываліся новыя вучылішчы; пасля скасавання ў 1839 *Брэсцкай уніі 1596* б. уніяцкія вучылішчы былі пераўтвораны ў правасл., частка з іх закрыта. У пач. 1850-х г. адбылася рэформа духоўных вучылішчаў, пасля якой працягвалі дзейнічаць толькі павятовыя вучылішчы. Яны мелі 3 аддзяленні: ніжэйшае, сярэдняе, вышэйшае з двухгадавым курсам навучання ў кожным. Асаблівасцю Беларусі была наяўнасць спец. духоўных вучылішчаў, якія рыхтавалі дзячкоў пры Літоўскай (з 1834) і Полацкай (з 1838) семінарыях. У пач. 1850-х г. гэтыя вучылішчы былі пераўтвораны ў класы па падрыхтоўцы псаломшчыкаў (праіснавалі да 1869). Паводле новага статута духоўных вучылішчаў 1867 замест 6-гадовага курсу навучання быў уведзены 4-гадовы, адбыліся змены ў вучэбнай праграме. Да сярэдзіны 1870-х г. паводле новага статута былі пераўтвораны ўсе духоўныя вучылішчы. Некаторыя з іх былі скасаваны. У Полацкай епархіі засталіся дзейнічаць 2 вучылішчы: Полацкае і Віцебскае, у Магілёўскай — 4: Аршанскае, Гомельскае, Магілёўскае, Мсціслаўскае, у Мінскай — 3: Мінскае, Пінскае і Слуцкае, у Літоўскай — 2: Віленскае і Жыровіцкае. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 у выніку рэарганізацыі сістэмы асветы правасл. духоўныя вучылішчы былі скасаваны.

*С.М.Васілі*